Добра для ўсіх – наш правадыр

# СУМЛЕННЕ

Жыве Беларусь!

ліпень 1990 г. выданне Слуцкай Рады БНФ №1

Наш адрас 223100 Слуцк да патрабавання
тэл 2-25-59

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava C89

## Ад рэдакцыі

Сення мы віншуем нашых чытачоў з выхадам першага нумару газеты "Сумленне". Праз нашу газету мы будзем знаёміць жыхароў Случчыны з мясцовымі праблемамі, навінамі і іншымі матэрыяламі, якія не даходзяць да чытача, якія не дазваляе друкаваць партыйна-бюракратычны апарат.

Рэдакцыя хоча бачыць нашу газету як альтэрнатыву афіцыйнаму выданню газеце "Шлях Ільіча", падначаленай у асноўным гаркому КПБ.

Рэдакцыя пры падрыхтоўцы кожнага нумару будзе як след вытрымліваць прынцыпы праўды і поўнай галоснасці, незалежнасці і плюралізму думак і поглядаў. Гэта азначае, што кожны, хто будзе лічыць неабходным выказаць свае думкі па таму ці іншаму пытанню, будзе мець такую магчымасць на старонках выдання. Ва ўсялякім разе карэспандэнцыя, накіраваная ў наш адрас, не застанецца без адказу. У сваю чаргу рэдакцыя "Сумлення" спадзяецца атрымліваць ад сваіх чытачоў дастатковую колькасць матэрыялаў, каб адчуваць, што наша газета патрэбна случчанам. І тады наша з вамі газета, паважаныя чытачы, сапраўды стане сумленнем грамадскасці Случчыны.

Міхась Надзея

## ЗВАРОТ

Устаноўчай канферэнцыі Слуцкай раённа-гарадской РАДЫ БНФ "Адраджэнне" да грамадзян горада і раёна

Паважаныя землякі! 21 красавіка 1990 г. устаноўчая канферэнцыя афіцыйна зацвердзіла стварэнне Слуцкай раённа-гарадской РАДЫ БНФ "Адраджэнне".

Рабочай мовай абрана беларуская мова, мова нашага народу, нашых продкаў.

Да гэтай пары ў Слуцку і раёне панавала і пануе адміністрацый-

на-камандная сістэма, на чале з партапаратам. Прадстаўнікі гэтай сістэмы перабудову разумеюць па-свойму. Яны пераходзяць з кабінета ў кабінет, з крэсла ў крэсла. Амаль што ўсе апаратчыкі перайшлі ў Саветы, ды цяпер маюць не па адной, а нават па дзве пасады. Такім чынам, нягледзячы на скасаванне 6-га артыкула Канстытуцыі, партапарат, не ўлічваючы думку народа, яшчэ больш замацаваў сваю ўладу. У выніку ўсіх гэтых апаратных гульняў, ніякіх дэмакратычных зрухаў на Случчыне не адбываецца. Пры гэтым, выкарыстоўваючы ўсе сродкі, у тым ліку хлусню, гэтая кіруючая сістэма ганьбіць, пэцкае граззю прыхільнікаў дэмакратыі, свабоды і галоснасці.

Кіраўніцтва Случчыны з'яўляецца кансерватыўным і антыдэмакратычным, як і вышэйшае кіраўніцтва рэспублікі.

Раённа-гарадская Рада БНФ "Адраджэнне" ставіць мэтаю:

— дэмакратызацыю ва ўсіх сферах жыцця на Случчыне;

— абарону правоў усіх грамадзян;

— павышэнне палітычнай свядомасці, адукаванасці і інфармаванасці грамадзян;

— дэмантаж адміністрацыйна-каманднай сістэмы на Случчыне;

— адраджэнне беларускай мовы, як мовы карэннай нацыі, народных традыцый, культуры;

— ажыццяўленне прынцыпу: уся ўлада народу праз Саветы;

— ушанаванне памяці ахвяраў фашызму і сталінскага генацыду на тэрыторыі Слуцкага раёна;

— прыняцце мер супраць забруджвання навакольнага асяроддзя;

— усебаковая інфармацыя жыхароў Случчыны аб экалагічнай абстаноўцы і вінаватых у забруджванні вады, паветра, зямлі.

Заклікаем усіх грамадзян Случчыны прыняць актыўны ўдзел у нашым руху.

Наша справа праўдзівая, а праўда заўсёды закрасуе!

Жыве Беларусь!

3 Адказы на пытанні старшыні Слуцкай Рады БНФ В. Траневіча

У сувязі з выданнем першага нумару газеты "Сумленне" супрацоўнікі рэдакцыі папрасілі адказаць на некаторыя пытанні старшыню Слуцкай Рады БНФ "Адраджэнне" Траневіча В.В.

— Валерый Васільевіч, адкажыце, калі ласка, як Вы адносіцеся да партыйнага і савецкага кіраўніцтва Случчыны?

— Калі паглядзець вачыма простага грамадзяніна на кіраўнікоў любога маштабу, і ў прыватнасці раённага і гарадского, мне здаецца, што яны з'яўляюцца вязнямі сістэмы. Той сістэмы, пры якой падпарадкаванне ідзе знізу ўверх, а загады зверху ўніз. Пры гэтым не адкрыю таямніцы, калі скажу, што кожны з апаратчыкаў імкнецца рухацца па службовай лесвіцы ўверх, дзе яго чакаюць яшчэ болей прывілеяў ды ільготаў. Не з'яўляюцца выключэннем і Слуцкія кіраўнікі. А дзеля таго, каб гэта адбылося, трэба адстойваць свае каставыя інтарэсы, стаяць на баку вышэйстаячага кіраўніцтва і не надта клапаціцца пра лес свайго народу.

Справа ў тым, што на працягу шмат гадоў дзейнічаюць і дзейнічалі гаркомы, райкомы ад імя партыі, ад імя народа, не адказваючы за вынікі сваіх дзеянняў.

— Растлумачце, калі ласка, як з'явілася і з якой мэтаю, усім вядомая лістоўка "Лідэры БНФ "Адраджэнне". Хто яны?"

— Па-першае, павінен адзначыць, што гэтая лістоўка вельмі хлуслівая і разлічана яна на людзей не свядомых. Чаму? Таму, што на фота і ў тэксце няма ніводнага лідэра БНФ. Лістоўка была надрукавана ў Слуцкай друкарні, тыраж яе склаў 10 тыс. экзэмпляраў. Афіцыйна заказчыкам быў выконваючы абавязкі загадчыка ідэалагічнага аддзела ГК КПБ В.Астрэйка, але хто загадаў яму надрукаваць гэтую лістоўку, мне дакладна невядома. Лічу, што мэтаю было скампраментаваць Беларускі Народны Фронт, тым больш, што яна была выдадзена і распаўсюджана за некалькі дзен да другога тура выбараў. Але самае цікавае ў гэтай гісторыі — за чые грошы была выдадзена

—

лістоўка? Напэўна, грошы былі з дзяржаўнай кішэні, а не з кішэні В.Астрэйкі. А калі кожны так захоча нешта друкаваць за дзяржаўны кошт? Гэта ўжо мае пытанне да праваахоўных органаў Слуцка.

— У дакладзе З.Ломаця на пленуме ГК КПБ сказана, што ў Звароце ўстаноўчай канфярэнцыі Слуцкай Рады БНФ да жыхароў Случчыны шмат амбіцыезнага, і як быццам бы да гэтага ніхто нічога не рабіў. Як Вы гэта ацэньваеце?

— Такім заявам я даўно ўжо не здзіўляюся. Бо партыйныя дзеячы заўсёды імкнуліся, калі не хапала аргументаў, знайсці такія словы, як напрыклад: амбіцыёзнасць, нацыяналісты, экстрамісты, кансалідацыя ўсіх здаровых сіл і г.д. А што маецца на ўвазе пад "усімі здаровымі сіламі" — невядома. Чаму так атрымліваецца? Таму, што заўсёды партыйныя кіраўнікі лічылі, што толькі яны гавораць ісціну і больш ніхто.

А наконт таго, што дагэтуль рабілася, я адкажу так. Рабілася, але не тое, што патрэбна народу.

Пабудаваныя буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе, а ні мяса ні каўбасы ў крамах няма, але слуцкая каўбаса ёсць у Маскве.

Знішчана родная беларуская мова, культура, нават у Слуцкім гарадскім палацы культуры /падкрэсліваю "культуры"/, не знойдзеш ніводнага слова на беларускай мове.

1 траўня 1986 года, калі радыяактыўны пыл ляцеў у бок Беларусі, случчане дружна прымалі ўдзел у дэманстрацыі і адпачывалі на свежым па-ветры. А пасля таго, ледзь не чатыры гады, замоўчваліся сапраўдныя памеры Чарнобыльскай бяды.

Асушана вялікая колькасць балот, з якіх вада паступала ў раку Случ, а ў апошні час пабудаваны новы саўгас "Слуцк". У выніку гэтага экалагічнае становішча яшчэ больш пагоршылася, і рака можа зусім знікнуць.

На Чарнобыльскія грошы наладжаны круізы за мяжу. Хто ў іх

прымаў удзел, якія "ахвяры" Чарнобыля, усім вядома.

У мэтах паляпшэння ўзроўню жыцця працоўных, амаль удвая павышаны аклады... кіруючым работнікам.

Спіс таго, што зроблена можна працягваць, але супынімся на гэтым. Я спадзяюся, што калі-небудзь будзе надрукавана "Чорная кніга" ўсіх гэтых спраў.

— Як Вы ставіцеся да ролі парткомаў на прадпрыемствах і установах?

— Лічу, што пра нейкую ролю парткомаў у жыцці калектываў не варта і казаць, бо яны на прадпрыемствах зусім не патрэбныя, але гэта справа камуністаў быць парткомам ці не быць. А цяпер уявім сабе, што здарыцца, калі ў нас з'явіцца, напрыклад, пяць або восем партый? Тады на кожным прадпрыемстве трэба будзе стварыць адпаведную колькасць парткомаў, столькі ж будзе сакратароў гэтых парткомаў, іхніх намеснікаў і г.д.

У выніку будзе, можна сказаць, анекдатычнае становішча; таму лічу, што парткомы ўсіх партый павінны быць толькі тэрытарыяльнымі.

— Дзякуй Вам за гутарку, поспехаў у грамадскай дзейнасці.

— Дзякуй.

## Пункт гледжання выбаршчыкаў

У сакавіку-траўні прайшлі выбары ў нашым горадзе і раёне. Цяпер у спакойнай абстаноўцы можна падвесці некаторыя вынікі, абмеркаваць, як праходзілі выбары, якія былі допушчаны памылкі. Але галоўнае трэба адзначыць перамогу дэмакратаў на выбарах у Вярхоўны Савет рэспублікі па тых акругах, дзе былі абраныя Н.Гарэлік і В.Качак. Прычын гэтай перамогі некалькі, але адной з галоўных з'яўляецца тое, што ў апошні час павысілася палітычная адукаванасць, свядомасць і актыўнасць выбаршчыкаў, якія ўжо не вераць у

"светлую будучыню", у паляпшэнне ўмоў жыцця людзей. Таму зараз яны звязваюць свае надзеі з выбраннем дэпутатаў сапраўды прагрэсіўных, патрыетаў свае зямлі, дэпутатаў, якія на самой справе будуць абараняць інтарэсы свайго народа, сваей рэспублікі, а не трымацца за мяккае ўласнае крэсла. Але ўсё гэта тычыцца, у асноўным, той часткі выбаршчыкаў, якія жывуць у горадзе. Сельскай мясцовасці працэсы дэмакратызацыі амаль што не датыкнуліся, калі не лічыць забастоўку ў калгасе "III Інтэрнацыянал". У вёсцы пэўная частка людзей яшчэ знаходзіцца ў стане гіпноза ды дрымоты. Менавіта таму, выкарыстоўваючы такія абставіны, партапарат імкнецца вылучаць свае кандыдатуры па сельскіх акругах, тым больш, што кіраўнікі гаспадарак фактычна падпарадкуюцца апарату і выконваюць усе іхнія загады і жаданні. Такім чынам, дзейнічаў першы сакратар ЦК КПБ Я.Сакалоў, па гэтаму ж шляху пайшоў і першы сакратар Слуцкага ГК КПБ З.Ломаць.

А вось калі ўзяць сакратара ГК па ідэалогіі К.Шпакоўскую, якая балаціравалася нават без альтэрнатывы па адной з выбарчых акруг горада, яна так і не здолела набраць патрэбную колькасць галасоў. Гэта прыклад росту самасвядомасці жыхароў горада. Але апарат "сваіх" у бядзе не пакідае. І таму К.Шпакоўская была тэксама вылучана кандыдатам і па сельскай акрузе. І, дзякуючы гэтаму, была абрана ў раённы Савет. Вось такая своеасаблівая тактыка, і яна пакуль што прыносіць поспех. Можна з упэўненасцю сказаць: калі б гэтыя кандыдаты балаціраваліся ў горадзе, яны б абраныя не былі.

У сувязі з тым, што ў руках апарата знаходзяцца ўсе рычагі ўлады, амаль што ўсе кіруючыя работнікі былі размеркаваныя па выбарчых акругах, дзе яны бадай без альтэрнатыў былі абраныя ў Саветы розных узроўняў. Толькі там-сям у барацьбу спрабавалі ўступіць незапланаваныя кандыдаты, але апаратчыкі рознымі сродкамі імкнуліся перашкаджаць ім быць абранымі.

Вельмі вялікай памылкай на гэтых выбарах было тое, што аднначасова праводзілася выбранне ў Саветы розных узроўняў. Выбаршчыкам цяжка было арыентавацца хто ёсць хто. Таму і асноўная ўвага выбаршчыкаў была накіравана на выбары ў Вярхоўны Савет рэспублікі, а тым часам, выкарыстоўваючы гэтае, у мясцовыя Саветы прайшлі амаль усе запланаваныя апаратчыкі, звязаныя між сабой уласнымі адносінамі. Сярод іх шмат людзей з застарэлым мысленнем, людзей застойнага часу, карацей кажучы, прыхільнікаў усё той жа камандна-адміністрацыйнай сістэмы, хаця самі сябе яны не лічаць такімі. Таму дэпутатам з радыкальнымі, дэмакратычнымі поглядамі прыйдзецца выкарыстоўваць усе свае магчымасці, каб процістаяць дэпутатам-кансерватарам і, увогуле, усяму апарату.

Выбарчая камісія

## Жыве аднак надзея

Прайшла першая сесія Мінскага абласнога Савета народных дэпутатаў новага склікання. На працягу двух дзен мы вырашалі арганізацыйныя пытанні. Сення хачу падзяліцца крыху сваімі ўражаннямі з выбаршчыкамі, паколькі цесны кантакт з імі лічыў у час прадвыбарчай кампаніі і лічу зараз як галоўнае складаемае паспяховай дэпутацкай дзейнасці.

Калі паспрабаваць увогуле вызначыць вынік сесіі, то можна сказаць, што яна не апраўдала тых надзей, якія звязвалі з выбраннем новага корпусу дэпутатаў выбаршчыкі, ды і самі дэпутаты. Сесія вырашыла ўсе пытанні павесткі дня, але ж тое, як гэта адбывалася, не дае падстаў да аптымізму. Як гэта ні сумна, аднак

варта прызнаць, што дэпутаты дэмакратычнай накіраванасці — да іх ліку далучыўся і я — на сёняшні дзень аказаліся ў меншасці. Што гэтак можа здарыцца, шчыра кажучы, я прадчуваў, але ж тое, з якім раўнадушшам кансерватыўная большасць дамагалася толькі аднаго — хутчэй прагаласаваць, хутчэй разгледзець усе пытанні сесіі — здзіўляла і болем аддавалася тое, што перад гэтай большасцю мы выглядзелі амаль што бездапаможнымі, страшна неяк рабілася ад адной думкі, што абяцанні перад выбаршчыкамі аб аднаўленні кіраўніцтва Саветамі могуць застацца толькі пустымі абяцаннямі.

Нашы намаганні дэмакратызаваць з самага пачатку ход сесіі не мелі неабходнай падтрымкі. Трэба прызнаць, што магчыма дзесьці была нявытрымка, мелі месца эмоцыі, але ўсе гэта рабілася дзеля інтарэсу справы ў адрозненні ад дэпутатаў-апаратчыкаў, якія як мага хутчэй стараліся асадзіць на месца тых, хто адстойваў сваю пазіцыю. Такая нецярпімасць праяўлялася з боку сакратара Уздзенскага райкома КПБ і другіх партыйных і савецкіх работнікаў, атрымаўшых дэпутацкі мандат, але яшчэ не прывучыўшых сябе лічыцца з меркаваннямі другіх.

Невыразнасць пачатку сесіі, ды і наогул увесь ход яе атрымаўся такім дзякуючы намаганням старшыні сесіі Паўлічкава М.П., які імкнуўся як мага хутчэй выбраць старшыней Савета першага сакратара абкома партыі Малафеева А.А. Пры цяперашняй раскладцы сіл гэта яму і ўдалося лёгка зрабіць. А ўжо далей ўсё атрымалася вельмі гладка: кансерватыўнай большасцю галасоў, практычна без абмеркавання, былі зацверджаны на кіруючых пасадах усе, хто планаваўся, акрамя некаторых старшынь пастаянных камісій. Зацверджаны нават і тыя, хто ў гады "застою" займалі гэтыя пасады.

У дэмакратычнай групы дэпутатаў — яна арганізацыйна пакуль не аформлена, але ўсе-такі існуе — склалася ўражанне, што нам толькі далі пагуляць у дэмакратыю. Непасрэдная віна тут ёсць з боку нашых выбаршчыкаў. Гэта іх раўнадушны падыход у час выбар-

чай кампаніі да сустрэч з кандыдатамі, абыякавасць да вынікаў выбараў дапамаглі мець такую раскладку сіл.

Гэткі вынік першай сесіі.

Болей канструктыўнымі на гэтай сесіі былі прапановы дэпутатаў з Барысава, Жодзіна, Маладзечна. Слуцкі корпус дэпутатаў да канца сябе не праявіў. Актыўнасцю вызначаюцца дэпутаты Гордзін Г.Л., Шулякоўскі В.М., Жогаль В.П.

Рана рабіць яшчэ нейкія вывады, аднак жыве надзея, што калі зараз выбаршчыкі будуць патрабавальнымі да дзейнасці сваіх выбраннікаў, то і вынікі будуць больш станоўчымі і дзейснымі.

Станкевіч Е.Д.,
дэпутат абласнога савета

Постскрыптум.

Гэтыя нататкі маглі быць надрукаваныя ў раённай газеце "Шлях Ільіча", але рэдактар знайшоў тут нейкую крамолу, якая наносіць, мабыць, удар па партыйнаму аўтарытэту, і адказаўся выносіць яе на суд выбаршчыкаў.

Службовы раман

Бязмерна багатая і шчодрая родная Беларусь. Наконт багацця хай не ўзнікае ў чытача сумнення. Скажам, мяса гаспадаркі Случчыны прадаюць штогод дзяржаве больш дваццаці тысяч тон. На душу насельніцтва, а гэта агульнапрызнаны ў свеце паказчык, у два разы больш, чым у самай развітай і забяспечанай краіне свету — Злучаных Штатах Амерыкі. А вось шчодрасць — не тая рыса, якой трэба было б хваліцца, бо яе праяўляюць міністэрскія і партыйныя чыноўнікі, забываючыся пры гэтым пра свой народ. Случчына, як і ўся Беларусь, корміць бязмежную збяднелую Расію, не атрымліваючы узамен эквівалентнага абмену.

Не трэба дакументальнага пацвержання сказанаму, падыдзіце

да мяснога аддзела любога магазіна горада. Колькі ўжо месяцаў не было тут высокаякаснага мяса? Рожкі ды ножкі — вось чым аплочваюцца нашыя мазалі, наша бязмежная братэрская любоў да магутнага суседа. Дзіўны гэта прадукт — свіныя галавы і гавяжыя ногі! Могуць тыднямі ляжаць на паліцах магазінаў звыш усякіх норм рэалізацыі, не псавацца. Аднак пагаворым аб іншых якасцях гэтых "мясных прадуктаў", аб якіх не ведаюць многія пакупнікі.

У нумары мясцовай газеты "Шлях Ільіча" ад 26 красавіка бягучага года змешчаны аж два матэрыялы аб становішчы з радыяцыяй на Слуцкім мясакамбінаце. Невялікую заметку "Санэпідэмстанцыя інфармуе", змешчаную на трэцяй старонцы, падрыхтавалі ўрачы В.Міскевіч, Л.Мандэль, Л.Машко, І.Лянэвіч: "... разам з тым на мясакамбінаце прадпісанні санэпідслужбы па паляпшэнню радыеметрычнага кантролю пры выпуску прадукцыі не выконваюцца. Для вырашэння пытання нармалізацыі радыелагічнага кантролю на прадпрыемстве справа перададзена ў пракуратуру".

І не зразумелым здаецца сцвярджэнне кіраўніка санэпідслужбы У.А.Лук, яно — на першай старонцы таго ж нумара газеты. Рубрыка, між іншым, называецца "Не верце чуткам". І сапраўды, калі прачытаць трэцюю старонку, а затым — першую, то не трэба верыць. Бо гаворыцца там прама процілеглае: "Кантроль за харчовымі прадуктамі самы строгі... Кантроль, безумоўна, патрэбен. Нельга дапускаць нават адзінкавых фактаў забруджанасці харчовых прадуктаў. Такія прадукты не выкарыстоўваюцца".

Гэтыя два процілеглыя матэрыялы з'явіліся на старонках газеты адначасова выключна недагляду яе работнікаў, якія часцей пішуць тое, што патрабуе гарком, а не тое, што хочам ведаць мы. А той жа У.А.Лук мог бы паведаміць шмат чаго цікавага і больш карыснага для гараджан у сэнсе аховы іх здароўя, што ўваходзіць у яго прафесійны абавязак. Пацвярджэнне таму — некалькі лістоў

аднаго службовага рамана.

29.12.89 г. № 2/2371

Дырэктару Слуцкага мясакамбіната т. Пятровічу К.А.

Копія: старшыні выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў т. Нікалаеву М.М.

У адрас санэпідстанцыі неаднаразова паступалі заявы, што мясакамбінат рэалізуе субпрадукты — ногі, галовы і інш. з павышаным утрыманнем радыенуклідаў, не праводзячы кантролю і размежавання.

Праверкай, праведзенай работнікамі СЭС, устаноўлена, што заявы абгрунтаваны. На Слуцкі мясакамбінат паступала з-за межаў раёна буйная рагатая жывёліна, свінні, авечкі, дзе ўзроўні радыеактыўных рэчываў у мясе перавышаюць часова-дапушчальныя...

Калі за мясам з павышаным утрыманнем радыенуклідаў вядзецца кантроль — перапрацоўваецца для каўбасных вырабаў забруджанае мяса, перавышаючае ўзроўні РВ — шляхам развядзення з чыстым у розных суадносінах, у залежнасці ад ступені забруджанасці, з наступным кантролем на прыборах КРВП-ЗАБ — то за сельгаспрадуктамі — ногі, галовы і інш — кантролю не вядзецца. Яны паступаюць у рэалізацыю з павышаным утрыманнем радыенуклідаў.

... Выходзячы з выкладзенага, прапаную: у сувязі з паступленнем жывёлы з зон "абмежавання" дынамічнага кантролю з павышаным утрыманнем Рв Вам неабходна праводзіць радыеметрычны кантроль за субпрадуктамі з наступнай рэкамендацыяй аб іх выкарыстанні. Тэрмін — пастаянна.

Аб праробленай рабоце прашу паведаміць у санэпідстанцыю да 11.01.90 г.

Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Слуцкага раёна У.А.Лук'янаў.

Вык. Ляневіч. тел.: 5-80-22.

Згадзіцеся, вельмі цікавы дакумент, які трэба было б паслаць усім пакупнікам, а не толькі К.А.Пятровічу і М.М.Нікалаеву.

Тыя усе гэта ведаюць, ні галоў, ні ног не купляюць. Таму дзве наступныя пасланыя гэтым кіруючым асобам паперы аб нездавальняючым радыелагічным кантролі мелі той жа эфект — нулявы. Таму не будзем нават прыводзіць іх тэкст, а больш падрабязна пазнаёмім вас з адным з апошніх і самых цікавых пісьмаў гэтага службовага рамана.

26.03.90 г. № 2/522

Міжраённаму пракурору, саветніку юстыцыі тав. Новіку А.В.

Галоўнаму дзяржаўнаму санітарнаму урачу Мінскай вобласці тав. Калясоўскаму В.С.

Аб нездавальняючай арганізацыі радыеметрычнага і дазіметрычнага кантролю на мясакамбінаце.

Давожу да Вашага ведама, што адміністрацыя Слуцкага мясакамбіната ігнарыруе патрабаванні санітарна-ветэрынарнага заканадаўства.

Неаднаразовыя праверкі, якія праводзіліся санітарна-эпідэміялагічнай службай па выкананню прапаноў за арганізацыяй радыелагічнага і дазіметрычнага кантролю за паступаючай сыравінай і гатовай прадукцыяй не прынеслі ніякіх вынікаў.

На прадпрыемстве дазіметрычны і радыелагічны кантроль ажыццяўляюць урач-радыелаг і 4 дазіметрысты, што навогул не дастаткова.

На ходу тэхналагічнага працэсу ўваходны кантроль пры прыемцы жывелы ажыццяўляецца дазіметрыстам не якасна. Не прадстаўляецца на сто працэнтаў праводзіць дазіметрычны кантроль з-за адсутнасці эстакады на мясакамбінаце. Таму вымярэнні праводзяцца выбарачна.

У МЖЦ кантроль за прадукцыяй ажыццяўляецца ўрачом-радыелагам і дзвума дазіметрыстамі не якасна з-за перагружанасці. Урач-радыелаг дадаткова ажыццяўляе кантроль за прадукцыяй, паступаючай з

халадзільніка у рэалізацыю, што зніжае якасць кантролю, а часам і поўную яго адсутнасць. Напрыклад: I сакавіка па I9 сакавіка I990 года праводзілася абследванне сыравіны I.03, 5.03, 7.03, I4.03, а ў астатнія дні радыелагічнае абследванне не праводзілася.

У адрас санэпідслужбы неаднаразова пастунпалі скаргі, што мясакамбінат рэалізуе субпрадукты /ногі, галовы і інш./ з павышаным утрыманнем радыенуклідаў, не праводзячы кантролю і размежаванняў, якія былі абгрунтаваны і пацвердзіліся.

У сваю чаргу Слуцкай СЭС у адрас адміністрацыі мясакамбіната неаднаразова паступала інфармацыя /пісьмы за № 2/237I ад 29.I2.89, № 2/94 ад I9.0I.90, № 2/I96 ад 5.02.90, акт ад 3I.0I.90, акт ад I3.03.90/ аб неабходнасці узмацніць кантроль і наладзіць дакладны і якасны дазіметрычны і радыеметрычны кантроль па ходу тэхналагічнага працэсу і ўкамплектаванне дазіметрыстамі цэхаў.

Але ж адміністрацыя мясакамбіната не прыняла адпаведных мер і ігнаравала патрабаванні санэпідстанцыі аб ажыццяўленні дакладнага і правільнага нагляду па ходу тэхналагічнага працэсу, забеспячэнні насельніцтва высакаякаснай прадукцыяй, і папярэджанні розных захворванняў.

Выкладзенае вышэй сведчыць аб наўмысным здзяйсненні правапарушэнняў з боку адміністрацыі мясакамбіната.

Прашу Вас прыцягнуць вінаватых да адказнасці, адпаведна з артыкулам 2I7 крымінальнага Кодэксу БССР.

Адначасова прашу Вас паведаміць аб мерах, прынятых да вінаватых, у адрас санэпідстанцыі. Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Слуцкага раена В.А.Лук'янаў.

Выканаў Ляневіч 5-80-22

Атрымала: Шыловіч 26.03.90.

Будзе вельмі дрэнна і вельмі несправядліва, калі гэты ліст

будзе апошнім у вельмі цікавым службовым рамане. Чым жа Ўсе гэта скончыцца?

Ці мы таксама адкінем рожкі ды ножкі, ці будзем ведаць праЎду!

Чыстую праЎду замест радыёактыЎных касцей!

Н.Міхалевіч

Ад рэдакцыі

[illegible]

Міхась Ханец

ЗВАРОТ

Устаноўчай канферэнцыі Слуцкай раённай арганізацыі БНФ "Адраджэнне" да грамадзян горада і раёна

[illegible]

Слуцкая Рада БНФ